

Глушанскі пасялковы ДК.

# "БУДАЎНІЧЫ БУМ":

## Умацоўваючы матэрыяльную базу, на Бабруйшчыне эканомяць бюджэтныя сродкі

**Першае, што адзначаеш, калі выпраўляешся ў Бабруйскі раён, дык гэта адсутнасць транспартных праблем. Едучы ў Бабруйск са сталіцы, можна выбіраць не толькі від транспарту, але і час адпраўлення з розніцай у дваццаць хвілін. Няма такіх праблем і на Бабруйшчыне: раён "акальцаваны" шашой, таму да любога з ягоных 216 населеных пунктаў можна дабрацца вельмі хутка. Удалае геаграфічнае становішча раёна дапамагло "раскруціць" цікавы маршрут "Па пушкінскіх мясцінах", які сёння абавязкова ўключаюць у сваю праграму турысты. Але такая "даступнасць" накладвае на культасветнікаў асаблівую адказнасць: мясцовыя жыхары часцяком наведваюць Мінск, параўноўваюць свае ўстановы культуры з лепшымі сталічнымі. Але... Пабыўшы на Бабруйшчыне, магу з ўпэўненасцю сцвердзіць: многія работнікі культуры тут сапраўды здзіўляюць! Перш за ўсё — цікавымі будаўнічымі аб'ектамі, узвядзенне якіх — ад фундамента да даху — на кантролі начальніка аддзела культуры Сяргея Багдановіча.**



Старшыня Бабруйскага райвыканкама Міхаіл Шалкоўскі на адкрыцці СДК у аграгарадку "Гарохаўка".

### З аўтаклубам навыперадкі

Бабруйск — адзін з тых гарадоў Беларусі, у якім поруч працуюць два аддзелы культуры: гарадскі і раённы. Калі ў горадзе пражывае 220 тысяч чалавек, дык у раёне — крыху больш за 21 тысячу. У такой сітуацыі культасветнікам раёна даводзіцца добра падумаць, як прыцягнуць вяскоўцаў да ўдзелу ў сваіх мерапрыемствах. Натуральна, такая канкурэнцыя спараджае здаровае спаборніцтва, ад чаго выйграюць найперш мясцовыя жыхары. Вяскоўцы, да прыкладу, маючы магчымасць наведваць розныя студыі ў Бабруйску, а часам і ў сталіцы, адзначаюць высокую якасць працы культасветработнікаў менавіта на раёне. Плён іх дзейнасці — заробленыя летась на платных паслугах 165 мільёнаў рублёў. І людзі задаволены, і бюджэт раёна грашыма папоўніўся.

— Кадры — наша галоўнае багацце. На іх любові да роднага краю і энтузіязме трымаецца ўся сфера культуры, — распачаў маё знаёмства з рэгіёнам старшыня Бабруйскага райвыканкама, кавалер ордэна Пашаны Міхаіл ШАЛКОЎСКІ. — Райвыканкам імкнецца як мага больш грошай укладаць у культуру. Напрыклад, на наступны год на набыццё касцюмаў мы запланавалі выдаткаваць 50 мільёнаў рублёў, а на "апратку" сцэны, мэблю, музычную апаратуру, камп'ютэры для ўстаноў культуры аграгарадкоў з бюджэту было выдаткавана больш за 150 мільёнаў рублёў.

Што да кадраў, дык сапраўды: на Бабруйшчыне працуюць унікальныя людзі. Мастацкі кіраўнік раённага Цэнтра культуры і вольнага часу Анжэла Салангіна не пабаялася ўзяць на сябе кіраўніцтва і народным танцавальным калектывам "Беларусь" з дваццацігадовай гісторыяй. Вучыць дзяцей і дарослых асабістым прыкладам: сама часта выходзіць на сцэну, гатовая ў любы момант замяніць любую з танцорак. На нядаўнім фестывалі ў Таліне журы было разгубілася: не магло выбраць лепшы нумар ансамбля і, парушаючы статут, дапусціла да ўдзелу ў конкурсе аж тры танцы! Не паспелі беларусы вярнуцца з Эстоніі, а ў Бабруйскі райвыканкам ўжо прыйшла падзяка дзівоснаму калектыву.

**— Бачу, што падобныя перамогі самадзейных калектываў Бабруйшчыны для вас — справа звыклая, — кажу начальніку аддзела культуры Бабруйскага райвыканкама Сяргею БАГДАНОВІЧУ, разглядаючы дыпломы і ўзнагароды шматлікіх ансамбляў і гуртоў.**

— Так, нашу самадзейнасць часта запрашаюць на абласныя і рэспубліканскія святы, фестывалі і конкурсы ў Расію, Польшчу, Украіну, Францыю і краіны Прыбалтыкі. Са 180 калектываў 13 маюць званне "народны". Падкрэслю, што 9 з іх дзейнічаюць на сяле. Уявіце сабе, што многім ансамблям — па 20-25 гадоў, а Варатынскі хор народнай песні сёлета адзначыў 70-годдзе!

**— Для замацавання поспехаў патрэбны высокакваліфікаваныя спецыялісты. Ці дастаткова іх на Бабруйшчыне?**

— У сістэму ўстаноў культуры раёна ўваходзяць РЦК, Цэнтр рамёстваў, 12 СДК, 7 СК, 7 клубаў-бібліятэк, 5 ДШМ і ДМШ з іх філіялам, гісторыка-краязнаўчы музей. Штат у нас укамплектаваны, але, на жаль, не ўсе кіраўнікі сферы культуры маюць адпаведную адукацыю. Выправіць сітуацыю дапамагаюць маладыя спецыялісты. Як правіла, гэта бабруйчане, якія навучаліся ў Магілёўскім вучылішчы культуры, Магілёўскім бібліятэчным тэхнікуме імя А.Пушкіна, Беларускім дзяржаўным універсітэце культуры і мастацтваў. Вось і сёлета да нас прыйшлі чатыры маладыя спецыялісты.

**— Звычайна іх больш прывablівае горад. Ці не адчуваюць жыхары маланаселеных і аддаленых вёсак дэфіцыт увагі да іх з боку культработнікаў?**

— Канешне, моладзь часцей пазірае на рабочыя месцы ў Бабруйску ці ў аграгарадках: там добрая інфраструктура, адрамантаваныя і прывабныя СДК. Аднак на вёсачкі, нават на тыя, дзе сёння жыве ўсяго 3-5 чалавек, мы не забываемся. За мінулы год далі 178 канцэртаў у маланаселеных пунктах. Набылі летась і аўтаклуб. Ён адразу ўключыўся ў працу па выкананні дзяржаўнай праграмы адраджэння і развіцця сяла. Загадчык аўтаклуба Галіна Мурашкевіч распрацоўвае і ажыццяўляе два напрамкі дзейнасці: інфармацыйнае і культурна-масавае абслугоўванне. Такая форма работы ўжо атрымала вялікую папулярнасць у патэнцыйных слухачоў. Яны нават заяўкі сталі падаваць, якія калектывы хацелі б у наступны раз пабачыць. Мы ж імкнёмся ўдасканальваць працу: абменьваемся вопытам з калегамі суседніх раёнаў, разглядаем прапановы мясцовых жыхароў. На сёння для нас галоўная задача — забяспечыць аўтаклуб уласнай гукаўзмацняльнай апаратурай.

### Садок ператвараецца ў СДК

На Бабруйшчыне сёння дзейнічаюць шэсць аграгарадкоў, а да канца 2009 года з'явяцца яшчэ два. І ў кожным з іх праводзіцца рамонт будынка СДК, які не абыходзіцца без пільнага нагляду начальніка аддзела культуры. Тое не дзіўна, бо першая адукацыя Сяргея Багдановіча — будаўнік. У кіраўніка, які сам цудоўна ведае, як правільна вывесці сцяну, пакласці дах ці правесці камунікацыі, — не схалтурыш. Начальнік аддзела культуры асабіста правярае ўсе планы, каб як мага эфектыўней выкарыстаць плошчу будынка і зэканоміць бюджэтныя сродкі, выдаткаваныя на добраўпарадкаванне.



Намеснік дырэктара Бабруйскай ЦБС Галіна Буткевіч і дырэктар ЦБС Любоў Схаба.

Асаблівым гонарам аддзела культуры стаў СК у аграгарадку Хімы, а калі дакладней — тры ў адным: клуб — музычная школа — бібліятэка. Пачыналася ўсё гэтак: будучаму аграгарадку быў неабходны клуб, таму ўзнікла прапанова адрамантаваць будынак старой установы культуры. Былы будаўнік Багдановіч падлічыў, колькі грошай можа пайсці на тое, каб зрабіць непрыдатнае памяшканне дыхтоўным і сучасным, і зразумеў, што гульня не вартая свечак. Асабліва, калі ў цэнтры вёскі стаіць двухпавярховы дзіцячы садок, у якім выхоўваецца толькі дзесяць дзетак. Спачатку ідэя не сустрэла спачування. Аднак былі падняты чарцяжы, зацверджана з будаўнікамі перапланіроўка. Пры рамонце захаваліся ўсе камунікацыі. У выніку такога аптымальнага падыходу на будаўніцтва было затрачана 840 мільёнаў і зэканомлены 1 мільярд рублёў.

Цяпер на гэтую славутасць Бабруйшчыны прыязджаюць паглядзець кіраўнікі з суседніх раёнаў. А начальнік аддзела культуры з задавальненнем праводзіць экскурсіі па аб'екце:

— Палову другога паверха займае музычная школа, якая пераехала сюды з будынка сярэдняй, што, дарэчы, месціцца побач. А ў яе вольныя пакоі перабраліся выхаванцы садка. ДМШ пасля такога "абмену" атрымала памяшканні для групавых і індывідуальных заняткаў, шыкоўную залу для тэарэтычных дысцыплін.

Другая палова паверха адышла бібліятэцы. Чытачы з ахвотай ідуць у светлыя абанемент і чытальную залу Хімоў, а супрацоўнікі больш за ўсё радуюцца вялікай плошчы, дзе нарэшце знайшлося месца ўсяму кніжнаму фонду. У зале на 80 месцаў хутка пачнуць выступаць шматлікія калектывы. Дзякуючы шчыльным заслонам, яна ў імгненне ператвараецца ў кінатэатр. Канешне, сістэмы Dolby тут няма, аднак хімоўцы з задавальненнем ідуць сюды, каб паглядзець на шырокім экране апошнія навінкі кінапракату.

У яшчэ адной "чвэрці" будынка адкрыты пакой для заняткаў дэкаратыўна-прыкладной творчасцю і дыскатэчная зала. Дырэктар установы Наталля Мурашова прадэманстравала вельмі ўдалы будаўнічы ход: паміж фае і клубам пастаўлены падвойныя шкляныя дзверы. Па-першае, гэта пазбаўляе ад дыскатэчнага шуму, па-другое, дазваляе старэйшым назіраць за моладдзю, не замінаючы адпачываць апошняй. Па-трэцяе, Наталля Анатольеўна выкарыстоўвае шкляную сцяну для правядзення выставак дзіцячай творчасці. У Хімах ніводны сантыметр плошчы дарма не прападае.

Работы, як будаўнічыя, так і ўласна культасветніцкія, у Хімоўскім СК сапраўды ўражваюць, а наперадзе, пасля ачысткі прылеглай тэрыторыі былога садка, — новы праект Наталлі Мурашовай і Сяргея Багдановіча: альпійскія горкі ды альтанкі навокал установы.



Дырэктар Міхалёўскага сельскага дома культуры Ірына Юшкевіч.



Дырэктар Глушанскага пасялковага ДК Наталля Бабенка.

# ЭФЕКТЫЎНАСЦЬ ПАТРАБУЕ МАДЭРНІЗАЦЫІ



Хімоўскі сельскі клуб-ДМШ-бібліятэка.



Свята-Нікольская царква, пабудаванная ў Цялушы Наталляй Варанцовай-Вельямінавай.

## Рынгтоны нараджаюцца ў Міхалёве

Калі на Бабруйшчыне распачынаюць рамонт ці будаўніцтва, дык абавязкова вырашаюць пытанне эканоміі энергарэсурсаў. Цяпер усе ўстановы культуры перайшлі на мясцовыя віды паліва. У кацельныя беспераробойна пастаўляюцца торфабрыкет і дровы. Аддзел культуры настойвае, каб на аб'ектах культуры выкарыстоўвалі якасныя матэрыялы, замянялі старыя шыбы і дзверы на шклопакеты, каб не губляць цяпло. Да таго ж, звычайныя лямпы замяняюцца на энергазберагальныя свяцільні.

— За шэсць месяцаў бягучага года пры плане мінус 13 працэнтаў мы зэканомілі мінус 23,5, — падкрэслівае начальнік аддзела культуры. — У кастрычніку сваім вопытам будзем дзяліцца з суседзямі: на базе нашай вёскі Туголіца пройдзе выязное пасяджэнне аблвыканкама па пытаннях энергазбераджэння.

Ацаніць на свае вочы рэканструкцыю з мадэрнізацыяй запрасілі ў Міхалёўскі СДК. Акрамя добрых паказчыкаў па энергазберажэнні, дырэктар СДК Ірына Юшкевіч можа пахваліцца і выдатным выкананнем плана платных паслуг. Ва ўстанове адкрыта філарманічная пляцоўка, на якой часта выступаюць абласныя тэатральныя калектывы і выканаўцы з Магілёўскай філармоніі. Вялікую частку грошай прыносяць абменныя канцэрты паміж ансамблямі і гуртамі СДК аграгарадкоў, а таксама міжраённыя абменныя праграмы з Глускім, Асіповіцкім, Кіраўскім ды іншымі раёнамі вобласці. Канешне, у вёсцы заробкі куды меншыя, чым у буйных гарадах, таму па дапамогу пры правядзенні платных канцэртаў культасветнікі звяртаюцца да прадпрыемстваў і сельскіх гаспадарак. Дзякуючы такому ўзаемадзеянню імпрэзы праходзяць з аншлагамі.



Кіраўнік народнага калектыву "Беларусь" Анжэла Салангіна вучыць танцаваць на асабістым прыкладзе.

Асобнай крыніцай прыбытку стала дыскатэка Міхалёўскага СДК. Паўнюткі танцпол забяспечвае арыгінальная музыка.

Справа ў тым, што дзі-джэй Васіль Пашкевіч сам стварае на сінтэзатары музыку, часта піша да сваіх мелодый словы. Сольныя канцэрты чаргуе з эксперыментамі на дзі-джэйскім пульце.

Паказчыкам таго, што вяскоўцы палюбілі трэкі родам з Міхалёва, стала тое, што самымі папулярнымі рынгтонамі мабільных тэлефонаў моладзі сталі песні Пашкевіча.

## Адзначыць юбілей у фітнес-зале

Кожны з адрамантаваных СДК аграгарадкоў імкнецца знайсці сваю адметнасць. Напрыклад, у першым на Бабруйшчыне аграгарадку "Кавалі" для наведвальнікаў СДК, музычнай школы і бібліятэкі (апошнія ўстановы падзяляюць з СДК дах) стварылі светлавы фантан. Дырэктар СДК Марына Дзешкавец прадэманстравала простую, але эфектную канструкцыю. Сквер стаў улюбёным месцам адпачынку мясцовых жыхароў. Днём музыку вады слухаюць наведвальнікі ўстановы, сярод якіх не толькі кавалёўцы, але і вяскоўцы сямі навакольных населеных пунктаў. Увечары за гульнёй каляровых ценяў назірае моладзь, якая прыходзіць на дыскатэку. У скверы культасветнікі разбілі клумбы, паставілі стылізаваныя пад даўніну лаўкі. Натуральна, цудоўна распрацаваны ландшафтны дызайн дапамагае выхоўваць успрыманне прыгожага, навучае культуры паважлівага стаўлення да навакольнага асяроддзя.

У пасёлку Глуша ДК амаль дваццаць гадоў лічыўся даўгабудам. Калі Сяргей Багдановіч прыйшоў на пасаду начальніка аддзела культуры, дык перш-наперш узяўся за выпраўленне гэтага бязладдзя. Цяпер тут праходзяць праграмныя канцэрты Міжнароднага фестывалю народнай творчасці "Вянок дружбы", з задавальненнем выступаюць зоркі беларускай эстрады. Апошнім разам да глушанцаў завітала Ірына Дарафеева — яшчэ нядаўна вяскоўцы і думаць не маглі, што зорка можа да іх прыехаць. "З новым ДК нам любыя мерапрыемствы пад сілу!" — з задавальненнем зазначае Сяргей Піліпавіч.

Дырэктарам у Глушанскім пасялковым ДК працуе выпускніца Беларускага дзяржаўнага універсітэта фізічнага выхавання і спорту Наталля Бабенка, таму і "разыначкай" установы сталі спартыўныя гурткі. У свабодным памяшканні створана спартыўная зала, дзе Наталля Аляксандраўна распачала фітнес-заняткі. Папраўляць сваё здароўе да яе прыходзяць і "прасунутыя" дзяўчаты, і жанчыны, якія і ў 50 гадоў з задавальненнем рухаюцца па зале ў такт музыцы. Для мужчын, якія скептычна ставяцца да "жаночага" спорту, хутка з'явіцца більярдны стол.

## Аб'яднаныя глінай

У якую ўстанову культуры на Бабруйшчыне ні заходзіла, паўсюль затрымлівалася каля шыкоўных ваз, вазонніц і разнастайных статуэтак з гліны. Як аказалася, у афармленні кожнага СДК абавязкова ўдзельнічае лаўрэат прэміі "За духоўнае адраджэнне" ў намінацыі "Народная творчасць" ганчар Юрый Боўда. Ён заўсёды дапамагае падрыхтаваць і сувенірную прадукцыю да святаў на Бабруйшчыне, разнастайныя медалі і ўзнагароды.



Народны майстар Юрый Боўда ва ўласнай майстэрні.



Дырэктар Хімоўскага СК Наталля Мурашова.



Дзі-джэй Васіль Пашкевіч.

Усе работы Боўды ўжо не змяшчаюцца ў маленькай майстэрні ганчара. Але хутка "будаўнічы бум" прыйдзе і сюды. Пры дапамозе бюджэтнага фінансавання аддзел культуры плануе адкрыць таленавітаму майстру ў раённым Цэнтры культуры і вольнага часу адпаведную студыю, дзе можна будзе паставіць замест адной — дзве прафесійныя печы.

Між іншым, ганчарную традыцыю Бабруйшчыны працягвае ў глушанскі дзіцячы калектыў "Глечыкі" пад кіраўніцтвам Аляксандра Арлова. Выхаванцы Аляксандра Васільевіча ўжо заявілі аб сабе: Паша Дыба і Валодзя Арлоў узялі на Міжнародным фестывалі дзіцячай творчасці "Залатая пчолка" дыпломы I і II ступені.

## Крок насустрач

Дырэктар Бабруйскай ЦБС Любоў Схаба таксама перш-наперш прывяла мяне палюбавацца будынкам цэнтральнай раённай бібліятэкі, якой амаль 100 гадоў. Агулам жа ў Бабруйскай ЦБС — 22 сельскія ўстановы і ЦРБ. Апошняй пашчасціла размясціцца ў старадаўнім асабняку — помніку архітэктуры канца XIX стагоддзя — у цэнтры горада. Да рэспубліканскіх Дажынак яго адрамантавалі.



Начальнік аддзела культуры Бабруйскага райвыканкама Сяргей Багдановіч.

— Да стагоддзя мы прыйшлі з добрым багажом. Сёння агульны кніжны фонд складае больш за 500 тысяч экзэмпляраў. Дзякуючы абмену з абласной бібліятэкай, ён пастаянна папаўняецца самай неабходнай літаратурай. У гэтым годзе для закупкі літаратуры выдаткавана 26 мільёнаў рублёў, — зазначыла Любоў Іванаўна. — Асаблівую ўвагу надаём установам аграгарадкоў: на іх добраўпарадкаванне з раённага бюджэту пайшло 50 мільёнаў рублёў.

У 2007 годзе з'явіўся ў раёне бібліобус. Загадчыца Галіна Чарнова распрацавала чатыры маршруты, у кожны з якіх уваходзіць па 3-4 вёскі, а то і больш. Разам з супрацоўнікамі Цэнтра сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва і аддзела ідэалагічнай работы штотыднёва выязджае па адрасах. Часцей за ўсё сустрэчы ладзяцца на базе дамоў сацыяльных паслуг, але Галіна Іванаўна не забываецца і наведаць дзетак з праблемных сем'яў.

Увогуле, бібліятэкары шмат увагі надаюць дзецям, якія аказаліся ў небяспецы. Як распавяла намеснік дырэктара ЦБС па працы з дзецьмі Галіна Буткевіч, шмат гадоў на Бабруйшчыне эфектыўна дзейнічае праект "Крок насустрач". Культасветнікі супрацоўнічаюць з намеснікам начальніка інспекцыі па справах непаўналетніх Яўгеніяй Доўнар, Бабруйскім цэнтрам пазашкольнай выхаваўчай працы праводзяць канцэрты ў раённым сацыяльным прытулку, наведваюць дзяцей-інвалідаў дома, ладзяць мерапрыемствы ў бібліятэцы. Не ў баку стаіць і прафсаюзная арганізацыя работнікаў культуры: яна выдаткоўвае грошы на падарункі такім дзецям.

## Сустрэча з Пушкіным на аутобусным прыпынку

А цяпер — пра знакаміты турыстычны маршрут, народжаны любоўю да кнігі. У 1970-х гадах актыўны чытач раённай бібліятэкі Леанід Міранові прапанаваў ладзіць у краі свята пушкінскай паэзіі. Ён вывучаў генеалагічнае дрэва знакамітага паэта і высветліў, што ў Бабруйску жылі ягоныя сваякі. А ў маёнтку Вавулічы, які сёння ўвайшоў у межы вёскі Цялуша, жыла ўнучка Пушкіна Наталля, па мужу Варанцова-Вельямінава. На грошы Наталлі Аляксандраўны ў вёсцы калісьці былі пабудаваны бальніца, школа, Свята-Нікольская царква, што дзейнічае і сёння.

Начальнік упраўлення культуры Магілёўскага аблвыканкама Анатоль Сінкавец, які ў той час быў начальнікам аддзела культуры Бабруйскага райвыканкама, падтрымаў ініцыятыву інтэлігенцыі. Таму ўжо 26 гадоў культасветнікі праводзяць тут Свята пушкінскай паэзіі, на якое ў Цялушу з'язджаюцца беларускія паэты і пісьменнікі. Сёлета беларускае тэлебачанне пад час свята праводзіла здымкі расійска-беларускага фільма пра мясціны, звязаныя з паэтам. Свята паэзіі дало штуршок развіццю турыстычнага маршруту па пушкінскіх мясцінах.

І ўсё б добра, але Цялушскі СДК не можа змясціць усіх ахвотных пабываць на мерапрыемствах. Культасветнікі выходзяць з гэтага становішча, выкарыстоўваючы ў якасці галоўнай пляцоўкі плошчу каля аўтобуснага прыпынку. Месца ўпрыгожваюць, расстаўляюць лаўкі, выносяць гукавую і светлавую апаратуру. Аднак, запэўнівае Сяргей Багдановіч, справа хутка выправіцца. Цялуша ў 2009 годзе стане аграгарадком, таму насупраць Свята-Нікольскай царквы паўстане новы СДК на 150 месцаў са спецыяльна падрыхтаванай для вулічных мерапрыемстваў пляцоўкай. Перад ім раскінецца вялікі парк з альтанкамі.

Дарэчы, на Бабруйшчыне рэкламуюць сёння яшчэ адзін турыстычны маршрут: да месца, дзе некалі стаяла вёска Панюшкавічы, у якой нарадзіўся Вінцэнт Дунін-Марцінкевіч. Цяпер там — мемарыяльны камень і стылізаваныя пад даўніну хаціны. Дарэчы, менавіта ў гэтых мясцінах святкавалі сёлета 200-гадовы юбілей знакамітага драматурга. Таму можна сцвярджаць, што праца культасветнікаў Бабруйскага раёна сапраўды мае сваё аблічча і прыцягальнасць у параўнанні нават з райцэнтрам. Вынікам таму — і "будаўнічы бум", і эканамічныя паказчыкі, і новыя турыстычныя ідэі.

**Настасся ПАНКРАТАВА,**
**наш спецкарэспандэнт**
**Мінск — Бабруйскі раён — Мінск**
**Фота аўтара**